# ІСТОРЫЯ

*Юрка КОПЦІК*

## Да пытання паходжання князёў Астрожскіх

Даследванне прысвечана пытанню паходжання вядомага ў XIV-XVII ст.ст. у Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай роду князёў Астрожскіх і іх адгалінавання князёў Заслаўскіх. Асноўная ўвага прысвечана крытычнаму аналізу ўсёй гісторыяграфіі паходжання князёў Астрожскіх, з акцэнтам на вузлавых пунктах даследванняў іншых аўтараў, якія запачаткоўваюць новыя версіі паходжання гэтага княжага роду. На падставе праведзенага агляду гісторыяграфіі, аўтар вылучае найбольш абгрунтаваныя версіі паходжання Астрожскіх за ўвесь час. Разглядаецца таксама праблема паходжання назвы горада Астрог і яе сувязі з гербавай сімволікай князёў Астрожскіх. У завяршэнне даследвання аўтар прапануе сваю версію паходжання князёў Астрожскіх ад князёў Гураўскіх, узважвае ўсе «за» і «супраць» гэтай версіі.

*Ключавыя словы:* князі Астрожскія, Астрог, Вялікае княства Літоўскае, Рэч Паспалітая, Валынь, гербы князёў Астрожскіх.

Праблема паходжання знакамітага ў XVI-XVII ст.ст. роду князёў Астрожскіх і іх адгалінавання кн. Заслаўскіх даўно цікавіла даследчыкаў і мае вялікую гісторыяграфію па гэтаму пытанню, пачаць якую трэба з гісторыкаў і хранiстаў XV-XVI ст.ст. Красінскага, Гваніні, Стрыйкоўскага і Папроцкага[1]. Паспрабуем прааналізаваць вузлавыя пункты гісторыі гэтага роду ад пачатку, абстрагуючыся ад пазнейшых напрацовак. Ужо

[1]Krasiński J. *Polska czyli opisanie topograficzno-polityczne w wieku XVI...* – Warszawa, 1852. – S. 112; Гваньїні О. *Хроніка європейської Сарматії* / Упор. отець Ю. Мицик. – Київ, 2007. – С. 404-405; Stryjkowski M. *Kronika Polska, Litewska, żmodzka i wszystkiej Rusi. – T. II.* – Warszawa, 1846. – S. 305; Idem: *O początkach, wywodach, dzielnościach, sprawach rycerskich i domowych sławnego narodu litewskiego, żemojdzkiego i ruskiego...* – Warszawa, 1978. – S. 167-168; Paprocki B. *Herby rycerstwa polskiego na pięcioro ksiąg rozdzielone.* – Kraków, 1858. – S. 448.

тады былі выказаны наступныя погляды на паходжанне князёў Астрожскіх: што гэты род паходзіць ад старых кіеўскіх князёў (Красінскі), канкрэтызавана іх паходжанне ад галіцка-валынскіх Рурыкавічаў – ад сына Данііла Раманавіча Галіцкага князя Рамана і яго сына Васіля (Гваніні, Папроцкі), а Мацей Стрыйкоўскі першы выказаў альтэрнатыўную думку паходжання Астрожскіх ад князёў Друцкіх, хаця паводле сучасных даследванняў В. Насевіча і В. Вароніна гісторыі князёў Друцкіх гэта ніяк не прасочваецца[2]. Праўда, Стрыйкоўскі сам жа ў іншых месцах гаворыць аб іх паходжанні ад галіцка-валынскай галіны Рурыкавічаў[3]. Такая непаслядоўнасць можа гаварыць або аб залежнасці храніста XVI ст. ад князёў Юрыя Слуцкага і Васіля-Канстанціна Астрожскага як фундатараў[4], або аб карыстанні аўтарам рознымі крыніцамі, з каторымі ён як след не разабраўся, што адзначыў яшчэ ўкраінскі гісторык Васіль Ульяноўскі[5], або тым, што Стрыйкоўскі выводзіў паходжанне і Астрожскіх, і Друцкіх ад аднаго і таго ж князя Дзімітра кіеўскага княжага дому.

Аднак першы гістарычна вядомы князь Астрожскі – Daniel Ostrogiej (Кромер), Daniel Ostrogski (Бельскі), Daniel de Ostrow (Ян з Чарнкова, Длугаш) – упершыню згаданы польскімі храністамі ў 1344 г. у сувязі з барацьбой Любарта Гедымінавіча з каралём польскім Казімірам за Галіцыю, у якой князь Данііл прыняў актыўны ўдзел. Ён разам з старостам перамышльскім Дашко і запрошанымі ў паход татарамі дайшоў аж да Віслы, дзе быў спынены Казімірам: ён не даў Астрожскаму пераправіцца і ўсё абмежавалася перастрэлкай з лукаў і самастрэлаў праз раку, у каторай ад татарскай стралы загінуў адзін з ваяводаў Казіміра – Войцех Цэлей[6]. З гэтага першага

[2]Насевіч В. *Род князёў Друцкіх у гісторыі Вялікага княства Літоўскага (XIV-XVI ст.ст.)* // Старонкі гісторыі Беларусі. – Менск, 1992. – С. 83-102; Варонін В. *Друцкія князі XIV стагоддзя* // Беларускі гістарычны агляд. Менск, 2002. – Т. 9, сшыткі 1-2 (16-17). – С. 3-29. Васіль Варонін у сваёй працы дастаткова крытычна ставіцца да версіі паходжання Астрожскіх ад князёў Друцкіх, не знаходзячы ніякіх пацвярджэнняў ёй.

[3]Stryjkowski M. *Kronika polska, litewska, żmódzka i wszystkiej Rusi.* – T. I. – S. 177, 179, 228, 249, 286, 291, 303.

[4]Соболев Л. В. *Генеалогическая легенда рода князей Острожских* // Славяноведение. – №2. – 2001. – С. 35-37.

[5]Ульяновський В. *Князь Василь-Костянтин Острозький: історичний портрет у галереї предків та нащадків.* – Київ, 2012. – С. 78.

[6]Joannis de Czarnkow. *Chronicon Polonorum* // Pomniki dziejówe Polski. – T. III. /

згадвання можна зрабіць наступныя высновы: у сярэдзіне XIV ст. Данііл Астрожскі ўжо валодаў Астрогам, ва ўсялякім разе жыў там, пра што сведчыць ягоны прыдомак, і відавочна знаходзіўся ў васальных адносінах з Любартам Гедымінавічам. Гэта ўскосна пацвярджаюць прывілеі караля польскага Ўладзіслава-Ягайлы 1386 г. і каралевы Ядвігі 1393 г. сыну Данііла Фёдару Данілавічу князю Астрожскаму. Прывілеі надта падобныя і мелі пацвярджальны характар, але там ёсць цікавыя месцы, дзе адносна Фёдара прама гаворыцца пра ягоных «родапачынальнікаў князёў Астрожскіх» (sui progenitores duces Ostrogienses) і пра іх службу «Любарту князю Ўладзімірскаму»[7]. Дагавор 1366 г. Любарта з Альгердам ясна паказвае, што Любарт быў ленным уладальнікам Луцкай зямлі, між іншымі гарадамі і Астрогам[8]. Што наводзіць на наступныя меркаванні: папярэднікі Данііла Астрожскага ці ягоныя браты ўжо былі князямі Астрожскімі і валодалі Астрогам як васалы Любарта. Гэтаму меркаванню супярэчаць памяннікі дубенскіх ды іншых украінскіх цэркваў і манастыроў, дзе самі Астрожскія сваіх продкаў пачынаюць пісаць толькі з Данііла Астрожскага, на якіх трэба спыніцца падрабязна. Праблема ў тым, што ў цікавячых нас памянніках «Род князя Константина Ивановича Острожского» (вядомага сваёй набожнасцю, таму і большасць памяннікаў звязаныя з ягоным імем) напоўнены цэлым шэрагам цяжкаідэнтыфікуемых імёнаў, не маючых ніякага дачынення да ўласна роду князя: там імёны архіепіскапаў, інакаў, нейкіх жанчын, прычым наўрад ці гэта толькі сучаснікі Канстанціна, а імя Данііла там наогул няма. Напрыклад, памяннік Дэрманскага манастыра пачынаецца з імёнаў Лазара, Фёклы, Марыі, інака Мітрафана, архіепіскапа Іосіфа, архіепіскапа Іоны, архіепіскапа Іоасафа і г. д. Выключэнне складае найбольш ранні

Wyd. A. Bielowski. – Lwów, 1872. – S. 622; *Kronika Polska Marcina Kromera.* T. I. Kraków, 1882, s. 609; *Kronika Polska Marcina Bielskiego*. Kraków, 1597, s. 229; Dlugosza Jana *Dziela wszystkie* wyd. staraniem Al. Przeżdzieckiego. *Dzieje Polski.* T. III. – Kraków, 1869. – S. 199.

[7] *Archiwum książat Sanguszków w Slawucie* (AS). – T. I. – S. 5, 15-16; *Archiwum Państwowe w Krakowie (Wawel). Archiwum Sanguszków*, (APAS). Papiery № 299; Grabowski M., Przezdziecki A. *Zrzódla do dziejów polskich.* – Wilno, 1843. – T. I. – S. 145-146, 151-152; *Akta grodzkię i ziemskię z czasów Rzeczypospolitej Polskiej, z archiwum tak zwanego Bernardyńskiego we Lwowie.* – T. V. – Lwów, 1872. – S. 25.

[8] *Полное собрание русских летописей*. (ПСРЛ) Т. II. Изд. Археографической Комиссией. – С-Пб., 1847. – С. 349-350.

памяннік царквы Кіева-Пячэрскага манастыра, што вёўся з 1483 г. і змяшчае запісы з папярэдніх сінодзікаў праўдападобна яшчэ кн. Васіля Фёдаравіча Краснага (†1446-1450), дзе род пачынаецца якраз з Данііла, г. зн. першага вядомага нам князя на Астрозе і верагодна Холме[9]*. Да памяннікаў мы яшчэ вернемся, але гэтая акалічнасць ясна ўказвае на адну важную рэч: Астрожскія памяталі пра сваіх продкаў і да другой паловы XVI ст., калі пры Васілі-Канстанціне Астрожскім пачалося легендарнае родатварэнне і радавод Астрожскіх рэтраспектыўна падоўжыўся да XIII ст.

Барацьба паміж Казімірам і Любартам завяршылася ўгодай 1366 г. – першым дакументам, дзе ўласна прысутнічае сам кн. Данііл (князь Данилий), названы другім пасля епіскапа луцкага Арсенія і першым сярод прысутных пры гэтым акце свецкіх асоб[10]. Васіль Ульяноўскі мяркуе, што сама гэтая форма падачы сведкаў яскрава гаворыць за тое, што Данііл паходзіў з мясцовага

[9]*Памятники, изданные Временной комиссией для разбора древних актов.* – Киев, 1859. – Т. 4, аддз. 1. – С. 107-109; *Девятисотлетие православия на Волыни.* – Житомир, 1892. – С. 585-598; *Древние волынские православные «помянники»* // Волынские епархиальные ведомости. – 1892. – Часть неофиц. – №15. – С. 433-446; Дзяржархіў Цярнопальскай вобл., ф. 258, воп. 3, спр. 1369, арк. 23-29; спр. 1368, арк. 26-51.

*Лявонцій Вайтовіч даводзіць, што Данііл нібыта ўжо ў 1440 г. валодаў Астрогам – спадчынай бацькі Васілька Раманавіча (?), унука караля Данііла Галіцкага, а да 1466 г. атрымаў яшчэ і Холмскае княства, Астрожскіх жа даследчык цвёрда выводзіць ад валынскіх Манамахавічаў-Раманавічаў, але довады Вайтовіча не ва ўсім пераканаўчыя і пакідаюць шэраг пытанняў. Напрыклад, Вайтовіч грунтуе свае высновы на Холмскім памянніку і антрапаніміі, уласцівай валынскім Манамахавічам – імёнах Даніла, Фёдар, Васілька і Раман – гл.: Войтович Л. *Родина князів Острозьких* // Записки наукового товариства ім. Шевченка. – Т. 231. – Львів, 1996. – С. 360; Його ж: *Князівські династії Східної Європи (кінець IX – початок XVI ст.): склад, суспільна і політична роль. Історико-генеалогічне дослідження.* – Львів, 2000. – С. 232; Його ж: *Князі Острозькі: спроба відтворення генеалогії династії* // Наукові записки Національного університету «Острозька Академія». Історичні науки. – Вип. 13. – Острог, 2008. – С. 48-49. У апошняй Вайтовіч слушна заўважае, што і да Люблінскай уніі князі ВКЛ не маглі не помніць – Рурыкавічы яны ці Гедымінавічы? (с. 45). Н. Якавенка справядліва крытыкуе довады Вайтовіча. – Яковенко Н. *Дзеркала ідентичності. Дослідження з історії уявлень та ідей в Україні XVI – початку XVIII століття.* – Київ, 2012. – С. 173.

[10]*AS.* – T. I. – Lwów, 1887. – S. 1; *Грамоти XIV ст.* / Упор. М. М. Пещак. – Київ, 1974. – №19. – С. 38.

княскага роду, а не з літоўскай дынастыі, бо ў адваротным выпадку гэта было б адмыслова падкрэслена[11]. Меркаванне небясспрэчнае; далёка не заўсёды гэтая акалічнасць агаворвалася ў корпусе дагавораў і прывілеяў таго перыяду. Напрыклад, у згаданых прывілеях Ягайлы 1386-га і Ядвігі 1993 г. Любарт названы толькі князем Уладзімірскім, хаця прыналежнасць яго да Гедымінавічаў нікім не ставіцца пад сумненне. Разам з тым месца ў іерархіі сведкаў сведчыць аб даволі высокім статусе князя Данііла.

Першым сярод свецкага набілітэту названы Фёдар Астрожскі і ў 1403 г. на акце прысягі Вітоўта перад Ягайлам, польскімі і літоўскімі панамі ў Любліне[12]. Відавочна, што Фёдар Астрожскі займаў высокае месца ў іерархіі дзяржавы. Нарэшце варта разгледзець яшчэ адзін дакумант: луцкі прывілей Вітоўта ад 3 ліпеня 1396 г. на пацьвярджэнне ўсіх уладанняў Фёдару Астрожскаму, дзе гаворыцца пра валоданне Астрогам Даніілам, бацькам Фёдара: «Записуем и записали есмо князю Федору Данилевичу Острог, как и отец его держал, из селы и зо всим, што к тому прислушает, как при отцы его было»[13]. Цікава, што як уладар Астрога згаданы толькі адзін ягоны бацька, кн. Данііл. Усё прыведзенае гаворыць за тое, што Данііл сапраўды быў першым уладаром Астрога з ягонага роду і быў толькі служэбным князем у валынскіх сюзерэнаў.

---

[11]Ульяновський В. *Князь Василь-Костянтин Острозький: історичний портрет у галереї предків та нащадків.* – С. 115.

[12]*Akta unii Polski z Litwą 1385-1791.* / Wyd. S. Kutrzeba, W. Semkowicz. – Kraków, 1932. – S. 47-48, №45.

[13]Антонович В., Козловский К. *Грамоты великих князей Литовских.* – Киев, 1868. – С. 1-4. Як указаў В. Ульяноўскі, дата дакумента ў публікацыі памылковая – 1390 г. замест 1396-га; *Kodeks listów XV w.* / wyd. Sokolowski i Szujski // Monumenta medii aevi historica res. gest. Pol. illustr. / wyd. Akademija Umećtwów w Krakowie. – T. VI. – 1882. – S. 41; *APAS*, papiery № 300; *AS*, t. I, № 157, s. 20; *Грамоти XIV ст.* № 67, с. 128; *Vitoldiana. Codex privilegiorum Vitoldi magni ducis lithuaniae 1386-1430.* / Publ. J. Ochmański. –Warszawa; Poznań, 1986. – S. 61. – № 56. Ад падазрэнняў публікатараў «Архіву Сангушкаў» у фальсіфікацыі гэтага прывілея яго пазбаўляе факт пацьвярджэння яго Жыгімонтам І у 1544 г. і наяўнасці яго арыгінала ў архіве Астрожскіх згодна вопісу 1627 г., у чым нельга не згадзіцца з В. Ульяноўскім: наўрад ці Астрожскія сталі б захоўваць у сваіх архівах фальсіфікат – гл.: Львоўская навуковая бібліятэка ім. В. Стэфаніка НАНУ, аддзел рукапісаў (далей ЛНБ АР). ф. 5, воп. 1, спр. ІІ. 1802, арк. 2-3.

Цяпер звернем увагу на тыя гербавыя выявы Данііла Астрожскага і ягоных нашчадкаў, зафіксаваныя на сфрагістычным матэрыяле, які не быў раней вядомы і каторы ўвёў у апошні час у навуковы зварот украінскі даследчык Алег Аднарожанка. Паводле апошняга, яны ўяўлялі з сябе даволі нескладаную фігуру, найбольш раннюю выяву каторай зафіксавала пячатка князя Данііла 1366 г. ці не з той самай мірнай угоды[14] (выява 1). Рэканструкцыя аўтара поўнага надпісу на пячатцы выглядае так: [ПЄЧА]ТЬ[КНѦZѦ]ДАНИ[ИЛА] (у рэканструкцыі Аднарожанкі яўна прапушчана адна літара «И» у імені «ДАНИИЛА»). Вось больш позняя выява з прамалёўкі пячаткі Фёдара Данілавіча Астрожскага 1387 г. (выява 2). Гэты сфрагістычны матэрыял робіць цалкам неактульнымі сведчанні Папроцкага і Нясецкага аб тым, што калі Канстанцін Іванавіч Астрожскі ўцёк з маскоўскага палону, то «каб нічога агульнага са сваім і айчыны непрыяцелем (Маскву мовіў, герб каторай таксама Яздзец Цмока б'ючы) не меў,.. з двух гербаў адзін склаўшы.., то ёсць з Агоньчыка і Лялівы; з каторых першы ёсць на гары, а другі на доле», узятыя з-за таго, што адзін ягоны сын Ілля меў жонкай Касцялецкую гербу Агоньчык, а другі, Васіль – Тарноўскую гербу Ляліва[15]. Нават безадносна таго, што калі Астрожскі ўцёк з палону ў 1507 г., то яшчэ не быў нават у першым шлюбе; першы сын Ілля нарадзіўся ў 1510 г., а другі, Васіль – у 1526 г., а ўзяў

[14]Однороженко О. *Князівська геральдика Волині середини XIV-XVIII ст.* – Харків, 2008. – С. 12-15; Він же: *Геральдика князів Острозьких у світлі нововиявлених джерел* // Антиквар. – № 5-6. – Травень-червень, 2017.– С. 110-112.

[15]Paprocki B. *Herby rycerstwa polskiego*.., s. 449; Niesiecki K. *Herbarz Polski.* – T. VII. – Lipsk, 1841. – S. 175-176. Пазнейшыя апалагеты гэтай памылковай тэорыі: Пекосинский Ф. *Источники русской геральдики* // Heraldica. С-Пб., 1900. – Т. 1. – С. 96-109; Назаренко Є. *Герб Острозьких і початок геральдичної поезії в Україні* // Знак. – 2000. – Ч. 22. – С. 3; Його ж. *Зображення герба Острозьких на книгах і архітектурних пам'ятках* // Там само. – 2001. – Ч. 24. – С. 5; Помазан І. *Інтерпретація герба князя Костянтина Костянтиновича Острозького в деяких зразках української поезії кінця XV – початку XVII ст.* // Там само. – 2000. – Ч. 22. – С. 4-5; Назаренко Є. *Зображення герба Острозьких на книгах і архітектурних пам'ятках* // Острогіана в Україні. – Старокостянтинів, 2001. – С. 135-138. Праўдападобна, што да іх далучыўся і Васіль Ульяноўскі: Ульяновський В. «Славний для всіх часів чоловік»: князь Костянтин Іванович Острозький // Серія: «Видатні постаті Острогіани». – Вип. 2. – Острог, 2009. – С. 12. І толькі Н. Якавенка разгледзела гэтую неадпаведнасць: Яковенко Н. *Дзеркала ідентичності*... – С. 172.

шлюб ён наогул ужо пасля смерці бацькі. Пазнавата для змены апошнім свайго герба, тады як ягоныя прадзеды ўжо карысталіся практычна гэтай жа сімволікай. Адносна ж герба Яздзец (св. Юрый на кані дзідай забівае Цмока) можна адзначыць, што з'явіўся ён у родзе Астрожскіх даволі позна (1546-1551 гг. на пячатках кн. Кузьмы Заслаўскага[16]), і няма доказаў таго, што Канстанцін Іванавіч Астрожскі ім наогул карыстаўся. Трывала ж гэты знак з'яўляецца ў гербавым рэпертуары Астрожскіх толькі ў 70-х гадах XVI ст., калі з'явілася патрэба падкрэсліць сваю прамую сувязь з старакіеўскім княжым домам[17]. Падобным чынам Яздзец з'яўляецца на гербах князёў Чацьвярцінскіх у 1620-х гадах, калі апошнія Астрожскія і Заслаўскія становяцца каталікамі, «здраджваюць» рускай нацыянальнай ідэі, і кіева-магілянская навуковая грамада пераарыентавалася: замест Астрожскіх яна вылучае Чацьвярцінскіх рэпрэзентантамі рускай ідэі, і Яздзец трывала замяніў вядомы з канца XIV ст. гербавы знак Чацьвярцінскіх[18], на што ўказала Наталля Якавенка[19].

Алег Аднарожанка трактуе першасную гербавую фігуру Астрожскіх як з'яднаныя слупам два паўмесяцы, што ляжаць рагамі долу над васьміпрамянёваю зоркаю[20]. Аднак давайце дэталёва прыгледзімся – іх формы далёка не нагадваюць класічную выяву паўмесяцаў, а павернутасць не ўверх, а ўніз таксама нехарактэрная ні для класічнай геральдыкі, ні для гербаў дагеральдычнага перыяду. Формы ранняй князёўскай геральдыкі, ці больш дакладна – гербатворчасці Украіны наогул уражальна нагадваюць нейкія канкрэтныя хрысціянскія, баявыя, паляўнічыя ці лавецкія прылады таго часу; дастаткова прагледзець апублікаваныя Аднарожанкам іх выявы[21]. Гэтак і выява родавага

---

[16]Однороженко О. *Князівська геральдика Волині середини XIV-XVIII ст.* – С. 37-47.

[17]Там сама. – С. 24-32 (мал. 22, 24-28).

[18]Там сама. – С. 48-66 (мал. 64-105).

[19]Яковенко Н. *Дзеркала ідентичності. Дослідження з історії уявлень та ідей в Україні XVI – початку XVIII століття.* – Київ, 2012. – С. 175-176.

[20]Однороженко О. *Геральдика князів Острозьких у світлі нововиявлених джерел.* – С. 110.

[21]Однороженко О. *До історії української генеалогії та геральдики: княжі роди XIV-XVII ст.* // Генеалогічні записки. – Львів, 2010. – Вип. 8 (нової серії 2). – С. 1-28.

знаку Даніїла і Фёдара Астрожскіх нагадвае рыбалоўную прыладу, а канкрэтна – астрогу (ў стараўкраінскай фанетычнай інтэрпрэтацыі острог, ад каторай найверагодна і паходзіць назва горада, насуперак меркаванню Тэадаровіча[22]).

Найбольш характэрнай рысай гербатварэння Украіны XIV ст. з'яўляецца шырокае выкарыстанне старых родавых знакаў, што мелі відавочна архаічнае паходжанне. У адрозненне ад гербавых сістэм большасці еўрапейскіх краін, рускае родавае гербатварэнне грунтавалася на дагеральдычнай традыцыі, што надала яму непаўторныя рысы, як адзначаў А. Аднарожанка[23]. Выява з пячаткі 1438 г. Фрыдэрыка Фёдаравіча князя Астрожскага, на каторай ёсць злучэнне верхніх вастракоў (назавем іх так) з ніжняй шасціканцовай зоркай, робіць гэтую выяву абсалютна падобнай да рыбалоўнай прылады (выява 3). Прычым выява гэтага знаку доўга захоўвала сваю сувязь з рыбалоўнай прыладай – выява родавага знаку Астрожскіх на пячатцы Канстанціна Іванавіча 1508 г. па-ранейшаму захоўвае характэрную форму астрогі. На батальнай карціне «Бітва пад Оршай» можна разгледзець герб Канстанціна Астрожскага на сігнальнай харугве гетмана – ён па-ранейшаму захоўвае тыя ж асаблівасці выявы астрогі, толькі знізу дададзена выява дугападобнай дэталі канцамі ўгару, блізкай да паўкола. Цікава, што ўкраінскі гісторык Ігар Міцько таксама заўважыў падобнасць гэтага знака з астрогай, але атаясамлівае гэты гербавы знак з трызубам св. Уладзіміра, які ўжываў Леў Уладзіміравіч ды іншыя галіцкія князі, але які з часам Астрожскія змянілі «до невпізнанного вигляду», і ён стаў падобным на астрогу (!)[24]. Захоўвае практычна гэтую ж форму і герб Іллі

[22]Теодорович Н. И. *Историко-статистическое описание церквей и приходов Волынской епархии.* – Т. II. – Почаев, 1890. – С. 629. Аўтар піша: «Горный отрог, который тянется в некотором расстоянии от р. Вилии… рассекается потом в самом городе и здесь образует как бы *острый рог* или угол; отсюда и город получил название *Остророга,* сократившееся впоследствии в *Острог*». Чаму ў такім разе антрапонім польскіх магнатаў Астрарогаў не скараціўся ў Астрогаў? Хаця, з іншага боку, гэта не выключае таго, што гэты шкаржак з-за свайго падабенства на астрогу мог быць зыходнай у этымалогіі назвы горада.

[23]Однороженко О. *Українська родова геральдика доби середньовіччя та раннього модерну (XIV-XVIII ст.)* / Автореферат дисертації на здобуття наукового ступеня доктора історичних наук. – Київ, 2009.

[24]Святослав Галасливий (І. З. Мицько). Князі Острозькі – нащадки короля Данила Галицького // Галицька брама. – №9 (69), вересень. – Львів, 2000. – С. 4-9.

Канстанцінавіча Астрожскага, хаця тут ўжо заўважна градацыя ніжняй фігуры выявы герба ў класічны паўмесяц – пераходная форма. А падобнасць герба Астрожскіх з фрагістычнай гербавай выявай князёў Галаўня-Астрожацкіх, на якой адсутнічае толькі зорка (выявы 4, 5, 6.), выводзіць гэтае прыпушчэнне да абгрунтаванай гіпотэзы. Справа ў тым, што звяртае на сябе ўвагу падобнасць тапонімаў Астрожац (першае згадванне князя Астрожацкага Івана Дзмітравіча адносіцца да 1446 г.) і Астрог, але зусім не тоеснасць іх. Што наводзіць на меркаванне, што этымалогія назваў гэтых розных валынскіх гарадоў магла быць аднолькавай, таму і выявы гербаў княскіх ліній, якія займелі звязаныя з тапонімамі прыдомкі, мелі падобныя рысы. Але іх адрозненне ў дэталях выяваў у адзін перыяд бытавання гаворыць хутчэй за аўтаномнасць іх узнікнення незалежна адна ад другой. Прыпушчэнне А. Аднарожанкі, што князі Астрожацкія маглі паходзіць ад палеглага ў 1399 г. у бітве на Ворскле князя Дзімітра, які быў сынам Данііла Астрожскага (на самой справе – мог быць, а мог і не быць[25]), а значыцца выявы родавых знакаў гэтых дзвюх князёўскіх ліняў падобныя з-за іх паходжання ад аднаго продка, не ёсць пераканаўчае[26]. Калі толькі першае згадванне князя Астрожацкага адлягае на 48 гадаў пазней ад гібелі мяркуемага іх родапачынальніка, то прыпушчэнне Аднарожанкі можна зняць: гэта колькі ж тады было б гадоў кн. Дзімітру ў 1399 годзе, калі ён быў сынам Данііла Астрожскага і стаў родапачынальнікам Астрожацкіх? Калі б ён і быў у гэты час яшчэ жывы, то ўжо наўрад ці змог бы выехаць на поле бітвы. Разам з тым можна адзначыць наступнае: калі прыняць гіпотэзу аб сувязі ранняга гербавага сімвала Астрожскіх з этымалогіяй назвы самога горада Астрога, то гэта яўна ўказвае на сувязь з Астрогам і саміх князёў

[25]*ПСРЛ*, т. IV / изд. Археографической Комиссией. – С-Пб, 1849. – С. 104.

[26]Однороженко О. *До історії української генеалогії та геральдики: княжі роди XIV-XVII ст.* – С. 27. Яшчэ Ю. Вольф слушна заўважыў гістарычную няпэўнасць існавання двух сыноў кн. Данііла Астрожскага – Аляксандра і Дзімітра. Гл.: *Ród Gedimina, Dodatki i poprawki do dziel hr. K. Stadnickiego*, przez Józefa Wolfa. – Kraków, 1886. – S. 36; Wolff J. *Kniaziowe litewsko-ruscy od konca czternastego wieku.* Warszawa, 1895. – S. 343. На погляд жа І. Міцько, палеглыя ў 1399 г. на Ворскле князі Міхаіл і Дзімітр Данілавічы былі з друцкіх князёў – Мицько І. *Статті, написані після вигнання з Інституту українознавства НАН України.* – Львів, 2000. – С. 14.

на неакрэслена раннім перыядзе існавання роду, калі толькі ствараўся сам гэты гербавы знак.

Ігар Тэсленка разглядаў магчымасць паходжання кн. Астрожацкіх ад кн. Астрожскіх. Гісторык канстатаваў, што «ні прямих, ані опосередкованих свідчень, навіть легенд про походження роду, не збереглося», гэтаксама, як адсутнічаюць звесткі пра Астрожацкіх у Стрыйкоўскага, Папроцкага і Акольскага. Няма згадванняў пра спароdненасць з Астрожацкімі і ў памянніках ці іншых паперах Астрожскіх. Тым не менш, Тэсленка дапускае магчымасць атаясамліваць кн. Дзмітра 1446 г. (калі быў згаданы ўжо толькі ягоны сын Іван) з кн. Дзмітрам, палеглым у 1399 г. на Ворскле[27]. На падставе выяўленых крыніц апошняй чвэрці XVI ст., калі кн. Януш Астрожскі атрымлівае вестку аб смерці апошняга з князёў Астрожацкіх кн. Андрэя Галаўні, «свого кревного й повинного». Толькі ў судовых справах выяўляецца нібыта спароdненасць Януша Астрожскага з Андрэем Галаўнёй-Астрожацкім[28].

Разам з тым трэба разгледзець яшчэ адзін дакумант: сын Любарта Фёдар, відавочна ўжо пасля смерці бацькі (†1383)[29] і заняцця па ім стальца, дае запіс князю Фёдару Данілавічу: «Се аз князь великий Федот, з братом своим Лазаром и Семеном и з маткою своею Ольгою» не будзе «вступатися» ў ягоныя бацькоўскія ўладанні[30]. Гэта важнае ўказанне на адну акалічнасць, а менавіта на тое, што князі Астрожскія не былі дзедзічнымі, спадчыннымі ўладальнікамі

[27]Тесленко І. *Походження князів Головнів-Острожецьких у світлі нововиявлених джерел* // Студії і матеріали з історії Волині. – 2012. – С. 132, 136.

[28]Там сама. – С. 139-140. Дзіўнасць і падазронасць гэтай нечаканай спароdненасці адзначае сам даследчык. Тут хіба можна толькі дапусціць крэўную спароdненасць у выніку нейкага здарэння на вайне ці паляванні за аказаную паслугу (такое практыкавалася). Гэта тым больш дапушчальна, што сам князь Януш у судзе не стаў настойваць на сваіх правах на частку спадчыны нябожчыка, аддаўшы ўсё яго сёстрам. Тым не менш, нягледзячы на недахоп крыніц, цвёрдых доказаў і гіпатэтычнасць у многім самога радаводу, І. Тэсленка ў выдадзеным у 2014 г. навукова-папулярным зборніку «Князі Острозькі» ўлучае радавод кн. Галаўнёў-Астрожацкіх у радаводнае дрэва Астрожскіх: Тесленко І. *Таємниця походження князівського роду* // Князі Острозькі. – Київ: Балтія-Друк, 2014. – С. 10-17.

[29]Столярова Л. *Свод записей писцов, художников и переплетчиков древнерусских пергаментных кодексов XI-XIV вв.* – М., 2000. – Док. 347.

[30]*AS*. – T. I. – S. 8.

Астрога, а трымалі яго як наданне, і сеньёр, у дадзеным выпадку сын Любарта, мог запатрабаваць вярнуць яго законнаму ўладару Валыні. І напэўна такая праблема перад Астрожскімі паўстала, бо не з'явіўся б на свет сам падобны запіс.

Звернем увагу таксама на адну астрожскую легенду, апублікаваную Навіцкім, а менавіта аб тым, што ў кн. Данііла і ягонай жонкі Васілісы памёр улюбёны маленькі сын Дзімітр, па каторым бацькі надта гаравалі: яго адпявалі 120 святароў, над магілай узвялі вежу, кожны дзень маліліся там, і г. д[31]. В. Ульяноўскі адзначыў у гэтай сувязі, што астражане-інтэлектуалы з усіх князёў Астрожскіх памяталі як першага князя толькі Данілу, а называнне імя ягонай жонкі гаворыць аб даўняй мікрагістарычнай памяці астражан, якая кансервуе даўнія веды[32]. Асабліва звязаныя з нейкай драматычнай сітуацыяй у мінулым, дададзім да гэтага. Ні пра якіх іншых Астрожскіх у самім горадзе не захавалася такіх легенд з такімі дэталямі, тым больш, што з канца XV ст. Астрожскія мала пражывалі ў Астрозе. Нямалаважна, што не зафіксавана легенд ні пра воднага Астрожскага да кн. Данііла. У Межырычы ў мясцовага святара нават зберагаўся ўяўны (у чым не можа быць сумненняў) партрэт Данііла Астрожскага, які бачыў яшчэ ў 1899 г. сучаснік і пакінуў сведчанне, што гэта «старадаўні партрэт кн. Даніла Астрожскага»[33]. Дарэчы, гэта яшчэ адзін аргумант супраць прыпушчэння Аднарожанкі: калі сапраўды ў кн. Данііла ўжо быў сын Дзімітр, памерлы ў маленстве, дык не магло быць двух сыноў з аднолькавым імем.

Абагульняючы ўсё вышэйпрыведзенае можна адзначыць наступнае: Астрожскія ў XIV ст. былі служылымі, васальнымі князямі на Валыні, каторыя атрымалі Астрог у «держание» за службу сюзерэну Валыні. Ніякіх цвёрдых довадаў іхнага паходжання ад князёў галіцка-валынскіх няма, хутчэй наадварот, як няма ніякіх цвёрдых звестак аб Астрожскіх раней за кн. Данііла.

---

[31]И. Н. (Новицкий И. В.) *Острожские легенды* // Воскресное чтение. – (Варшава). – 1933. – №42-43. – С. 652.

[32]Ульяновський В. *Князь Василь-Костянтин Острозький: історичний портрет у галереї предків та нащадків*. – С. 119.

[33]Луц В. *З листування Ореста Фотинського* // Пам'ятки сакрального мистецтва Волині на межі тисячоліть: питання дослідження, збереження та реставрації. – Луцьк, 1999. – С. 11.

У перыяд перад Люблінскай уніяй 1569 г., і асабліва пасля яе, знаёмства з класічнай геральдыкай і генеалогіямі польскай шляхты, літоўска-рускія княжыя роды пачынаюць падганяць свае гербавыя знакі пад класічныя геральдычныя ўзоры, а пазней пачынаюць стварацца і легендарныя генеалогіі княжых родаў, пакліканыя зрабіць іх больш даўнімі і больш важкімі ў гістарычнай рэтраспектыве[34]. Асабліва гэта стала заўважна ў др. палове XVI ст. Не пазбеглі гэтага памкнення і князі Астрожскія, у прыватнасці Васіль-Канстанцін. Якраз у гэты перыяд з'яўляецца «класічны» варыянт герба Астрожскіх (выява 7), а пазней і чатырохчасткавы герб мецэната ў старадруках Астрожскай друкарні 1578-1607 гг. (выява 8), на пячатках 1592-1602 гг., знакамітым залатым медалі князя і браме Дубенскага замку[35]. У гэты перыяд пытанне паходжання Астрожскіх разглядалася геральдыстамі, панегірыстамі й гісторыкамі неаднойчы[36]. У 1574 г. адзін з панегірыстаў упершыню расплывіста называе Астрожскіх «нашчадкамі старых кіеўскіх князёў». Праз некалькі гадоў радавод выбудоўваецца ў безперарыўную лінію – ад кн. Уладзіміра «першахрысціцеля» да караля Данііла Галіцкага, яшчэ пазней Данііла Галіцкага назавуць продкам Астрожскіх у восьмым калене. Але і гэтая версія падалася недастаткова прэстыжнай, і вось Астрожскіх звязваюць ужо з першапродкам Русам, «пачынальнікам Рускай зямлі».[37] В. Ульяноўскі ўказвае на цікавы дакумант, які захаваўся сярод папер Астрожскіх пачатку XVII ст.: генеалагічную схему, якая практычна паўтарае схему Папроцкага і Гваніні, але дзе пачынальнікам роду

[34]*Українські гуманісти епохи Відродження.* – Київ, 1995. – Ч. 2. – С. 212; *Українська поезія XVII століття (перша половина): антологія.* – Київ, 1988. – С. 93-119; Яковенко Н. М. *Паралельний світ: дослідження з історії уявлень та ідей в Україні XVI-XVII ст.* – Київ, 2002. – С. 283; віна ж: *Українська шляхта з кінця XIV до середини XVII ст. (Волинь і Центральна Україна).* – Київ, 1993. – С. 76.

[35]Пожарський А. *Герби на стінах Дубенського замку* // Четверта наукова геральдична конференція. – Львів, 1994. – С. 60-61.

[36]РИБ. – С.-Пб. – Т. XIX. – 1903. – стб. 1000; *Українська поезія. Кінець XVI – початок XVII ст.* – Київ, 1978. – С. 62; *Українська література XVII ст.* – Київ, 1987. – С. 102; Яковенко Н. М. *Українська шляхта з кінця XIV до середини XVII ст.* – С. 88.

[37]Яковенко Н. *Дзеркала ідентичності.,* с. 16-17. Барташ Папроцкі дадае сваё тлумачэнне да герба Астрожскіх: яны «маюць свой пачатак ад аднаго продка з Лехам і Чэхам» – Paprocki B. *Herby rycerstwa polskiego.* – S. 447.

пазначаны ўжо князь Васіль Раманавіч, названы першым князем Астрожскім[38]. Адначасна панегірыстамі ствараецца ідэалізацыя князёў Астрожскіх і яны трывала ўпісваюцца ў шэраг кіеўскіх валадароў старажытнарускага часу[39]. У гэты перыяд з'яўляецца «ўдакладненая» генеалогія Астрожскіх, знойдзеная ў 1856 г. у дубенскім архіве Астрожскіх[40]. Гэтая генеалогія выглядае наступным чынам: Уладзімір Раманавіч (князь берасцейскі і валадзімірскі, 1320) → Васіль-Георгій (Юрый) Уладзіміравіч → Данііл Васільевіч, першы князь на Астрозе (1340 – 1351) → Фёдар Данілавіч (†1436) → Васіль Фёдаравіч Красны (†1450) → Іван Васільевіч (1453) → Кастанцін Іванавіч (†1531) → Ілля Канстанцінавіч (†1539) → Канстанцін (Васіль) Канстанцінавіч (†1608). Доказы таго, што самі Астрожскія былі зацікаўленымі ў «удакладненні» сваёй генеалогіі адмыслоўцамі ў гэтай сферы, якіх у той перыяд было нямала на абшарах Рэчы Паспалітай, і афіцыйна паслугоўваліся гэтай генеалогіяй, ёсць у матэрыялах вопісу архіву князёў Астрожскіх 1627 г.: Астрожскія на пасяджэнні Люблінскага трыбуналу 1590 г. у справе за валоданне Сцяпанню з шэрагам антаганістаў, каб разблытаць розныя спародненасці з Радзівіламі, Гальшанскімі, Заслаўскімі і Чартарыйскімі, прадставілі там сваю генеалогію[41]. Тут яўна быў замешаны палітычны чыннік, што заўважыла яшчэ Н. Якавенка, але Сергій Плохій вылучыў і прычыну гэтага: на Ўкраіне род Астрожскіх асабліва актыўна намагаўся звязаць сваё паходжанне з часам Кіеўскай Русі, Васіля-Канстанціна Астрожскага панегірысты параўноўвалі з Уладзімірам Святым і Яраславам Мудрым, бо гэта павінна было ўказаць сучаснікам на ягонае прамое паходжанне ад кіеўскіх Рурыкавічаў (відавочна, адклаўшы ўбок сваю галіцка-валынскую версію, якая, тым не менш, працягвала жыць у творах панегірыстаў і літаратараў паралельна з кіеўскай, бо Данііл Раманавіч Галіцкі быў законна

[38]*Działy xiążąt Ostrogskich* // ЛНБ АР, ф. 91 (Радзімінскі), спр. 181/VI-4, ч. 1-б, арк. 36-39; Ульяновський В. *Князь Василь-Костянтин Острозький: історичний портрет у галереї предків та нащадків*. – С. 77.

[39]Яковенко Н. М. *Паралельний світ*. – С. 285-286.

[40]ЛНБ АР, ф. 91 (Радзимінскі), спр. 181/VI-4, ч. 2, арк. 136; ч. 3, арк. 391; Ульяновський В. *Князь Василь-Костянтин Острозький: історичний портрет у галереї предків та нащадків*. – С. 101.

[41]ЛНБ АР, ф. 5 (Оссолінські), воп. 1, спр. II, 1802, арк. 4, 42. Захавалася нават падборка генеалагічных складанак – сляды работы найманых генеолагаў.

каранаваным уладаром[42]. Праўда, род галіцка-валынскіх князёў Раманавічаў і Мсціславічаў вядомы паіменна і згас у 1320-х гадах[43].) У тагачаснай Еўропе асаблівую каштоўнасць мелі сапраўдныя ці нават уяўныя генеалогіі тых дынастый, якія страцілі ўладу тады, калі і сам край страціў незалежнасць. Гэта давала глебу развіваць ідэі адраджэння дзяржаўнасці краю, паколькі засталіся прамыя, а значыцца законныя спадкаемцы старых, першасных уладароў: Васіль-Канстанцін Астрожскі прэтэндаваў на прамое паходжанне ад кіеўскіх Рурыкавічаў бо гэта давала яму права разглядаць яго як прэтэндэнта на карону Рэчы Паспалітай. І ён быў ім у сапраўднасці: нават на ягоных пячатках з'яўляецца лацінскі надпіс з агульнаеўрапейскай формулай вышэйшай улады – «Канстанцін Канстанцінавіч міласцю Божай князь Астрожскі». Рускамоўны варыянт гэтай формулы з'яўляецца ў прадмове Астрожскай Бібліі[44]. Стварэнне дынастычнай легенды давала Астрожскім права «дынастычнага легалізму»[45]. А гісторыяграфічныя пошукі мысляроў-інтэлектуалаў (Іова Барэцкага, Захарыя Капысценскага, Сільвестра Косава, Іпація Пацея ды інш.) прывялі да ўсталявання думкі повязі з мінулым праз бесперарыўнасць гісторыі ад Кіеўскай Русі да сучаснай ім Русі – ўласна Украіны і Белай Русі XVI-XVII ст.ст.

Падобна на тое, што гэта зусім не прыватнае прыпушчэнне Плохія: Т. Кемпа апублікаваў звесткі з ліста Ю. Баяноўскага да К. Радзівіла 1595 г. аб тым, што пасля смерці маскоўскага

---

[42]Яковенко Н. М. *Паралельний світ.* – С. 283; *Українська поезія XVII століття (перша половина).* – С. 93-119. Герасім Сматрыцкі яшчэ ў 1587 г. у сваім творы «Ключ царства небесного» піша, што род Аляксандра Астрожскага паходзіць ад хрысціцеля Русі кн. Уладзіміра – Смотрицький Г. *Ключ царства небесного* // Українська література XIV-XVI ст. – Київ, 1988. – С. 213-215.

[43]Вядома, што ў пачатку 1323 года памерлі ці загінулі ў барацьбе з манголамі апошнія Раманавічы – князь галіцкі Леў Юр'евіч і князь валадзімірскі Андрэй Юр'евіч; гл.: Шабульдо Ф. М. *Земли Юго-Западной Руси в составе Великого княжества Литовского.* – Киев, 1987. – С. 22; Dąbrowski D. *Rodowód Romanowiczów książąt halicko-wołyńskich.* – Poznań, Wrocław, 2002. – S. 271-275; Kempa T. *Dzieje rodu Ostrogskich.* – Toruń, 2003. – S. 6; Dąbrowski D. *Genealogia Mścisławowiczów. Pierwsze pokolenia (do początku XIV wieku).* Kraków, 2008.

[44]Яковенко Н. М. *Паралельний світ.* – С. 177; *Українська література XIV-XVI ст.* – С. 200-201.

[45]Плохій С. *Наливайкова віра: Козацтво та релігія в ранньомодерній Україні.* Київ, 2005. – С. 203-204.

цара Фёдара Іоаннавіча (апошняга Рурыкавіча на маскоўскім стальцы) Васіль-Канстанцін Астрожскі хацеў дабівацца сваіх правоў на Северскую зямлю, напэўна як прамы нашчадак Рурыкавічаў, якія валодалі гэтым краем[46]. Калі верыць гэтай інфармацыі з ліста Баяноўскага, то яна ўскосна дадае вагу ўжо сучаснай версіі Ігара Міцько аб паходжанні Астрожскіх і нібыта роднасных ім Друцкіх і Чацьвярцінскіх[47] з северскіх князёў, каторыя ў першай палове XIV ст. правілі ў Кіеве, а потым перайшлі на Валынь і парадніліся з галіцка-валынскімі Раманавічамі[48]. А. Аднарожанка далучаецца да версіі Міцько аб роднаснасці Чацьвярцінскіх Астрожскім: выявы двух перакрыжаваных паўколаў, узятых з прамалёвак з пячатак кн. Аляксандра Чацьвяртні 1387-1388 гг. у геральдычных выпісах Яна Замойскага[49], паводле Аднарожанкі, знаходзяць найбліжэйшыя паралелі ў найдаўнейшых геральдычных помніках князёў Астрожскіх, родавыя гербы каторых таксама мелі ў сваёй аснове выявы двух паўколаў, хаця і з іншым размяшчэннем і дадатковымі элементамі. «Як бачым, – піша ён – геральдычны матэрыял пацвярджае версію І. Міцько пра супольнае паходжанне Астрожскіх і Чацьвярцінскіх і дазваляе з вялікай доляй верагоднасці сцвярджаць, што Аляксандр Чацьвярцінскі быў адным з малодшых сыноў кн. Даніла Васількавіча з Астрога, і што гэта ён фігуруе сярод іншых князёў Астрожскіх у манастырскіх сінодзіках пад імем Аляксандра-Алексія»[50]. Але па-першае, Аднарожанка супярэчыць сабе, бо

[46]Kempa T. *Konstanty Wasyl Ostrogski (ok. 1524/1525-1608), wojewoda kijowski i marszałek ziemi wołyńskiej*. – Toruń, 1997. – S. 12.

[47]Міхаіл Максімовіч адносіў князёў Чацьвярцінскіх і Сцяпаньскіх да нашчадкаў Турава-Пінскіх князёў – гл. Максимович М. *Письма о князьях Острожских к графине А. Д. Блудовой*. – Киев, 1866. – С. 3-6.

[48]Мицько І. *Загадки родоводу князів Острозьких: хто був протопластою роду?* // Острозький краєзнавчий збірник. – Острог, 2010. – Вип. 4. – С. 5-6. Версія цікавая, але праблема ў тым, што погляды Міцько на Астрожскіх пастаянна мяняюцца, аргументацыя ж у яго носіць пераважна розумаглядны, імаверны характар. Тым не менш, гэтая перспектыўная версія чакае сваёй распрацоўкі.

[49]Piekosiński F. *Jana Zamojskiego notaty heraldyczno-sfragistyczne* // Studya, rozprawy i materyały z dziedziny historyi polskiej i prawa polskiego. – Kraków, 1907. – T. VII. – S. 61-62.

[50]Однороженко О. *До історії української генеалогії та геральдики: княжі роди XIV-XVII ст.* – С. 1.

ў іншай публікацыі ён сцвярджае, што першасная гербавая выява Астрожскіх уяўляе два з'яднаныя слупом паўмесяцы, а не паўколы[51], а па-другое, выявы знака з пячатак кн. Чацьвяртні з выпісаў Яна Замойскага больш падобныя на выцягнутыя авалы, падковы ці петлі, чым на паўколы[52](выява 9), і сам знак мае яўна іншую этымалогію, чым гербавая выява Астрожскіх. Нарэшце не будзем забываць заўвагу Ю. Вольфа аб няпэўнасці існавання сярод сыноў кн. Данііла Астрожскага кн. Аляксандра (гл. зноску 26).

Міцько ўжывае ў сваіх довадах прынцып валынскіх нашчадкаў Манамаха называць сваіх унукаў імем дзеда: унук Данііла Раманавіча Галіцкага ёсць Данііл Мсціславіч, а Данііл Астрожскі мае быць ягоным унукам і сынам Мсціслава-Глеба Данілавіча, жонкай каторага, і значыцца маці Данііла Астрожскага, мелася быць сястра турава-пінскага князя Юрыя Тураўскага. У падмацаванне сваёй гіпотэзы Міцько прыводзіць сінодыкі і дыптыхі цэркваў і манастыроў, а таксама прыцягвае хрышчальныя імёны валынскіх князёў да патронімаў валынскіх цэркваў[53]. Як мы ўжо адзначалі, лагічныя пабудовы разважанняў Міцько носяць «шматярусны», складаны і хісткі характар, ад сваіх ранейшых пазіцый ён сам жа лёгка адмаўляецца, а таму яны лёгка даступныя крытыцы (напрыклад, Міцько не разглядае варыянты калі ўнук мог быць не адзін. І чаму з вядомых ўнукаў Данііла Астрожскага ніхто не названы імем дзеда? Н. Якавенка вывела найбольш ужываны рэпертуар імёнаў у пэўных княжых родаў, і ў Астрожскіх ён складаўся з Васіля і Івана[54]. Але і ён пры першым разглядзе таксама даступны крытыцы.) Аднак, з іншага боку, давярацца познім радаводам і генеалагічным схемам перыяду інтэнсіўнага герба- і родатварэння, нярэдка легендарнага, як гэта дазваляюць сабе Вайтовіч, Аднарожанка ды іншыя даследчыкі, таксама наўрад ці варта[55].

---

[51]Однороженко О. *Геральдика князів Острозьких у світлі нововиявлених джерел.* – С. 110.

[52]Однороженко О. *До історії української генеалогії та геральдики.* – С. 2.

[53]Мицько І. З. *Статті, написані після вигнання з Інституту українознавства*. – С. 9-17.

[54]Яковенко Н. М. *Паралельний світ*. – С. 52-53.

[55]Паводле Ю. Вольфа, не менш 250 рускіх і літоўскіх родаў даводзілі сваё князёўскае паходжанне, самым вядомым з каторых былі Радзівілы, каторыя ўсё ж дабіліся гэтага тытулу ў Еўропе афіцыйна: Wolff J. *Kniaziowie litewsko-ruscy od konca*

Пачынаючы ад сына Данііла Астрожскага князя Фёдара Данілавіча, ягонага брата і сястры радавод Астрожскіх вядомы[56]. Сыны Васіля Краснага падзялілі спадчыну Астрожскіх: старэйшы сын кн. Іван працягнуў род Астрожскіх, малодшы, кн. Юрый, зрабіў Заслаў (валынскі) сваёй рэзідэнцыяй і заснаваў лінію князёў Заслаўскіх[57]. Са смерцю ў 1620 г. сына Васіля-Канстанціна кн. Януша Астрожскага спыняецца род князёў Астрожскіх па мужчынскай лініі, са смерцю ў 1654 г. Ганны-Алаізы князёўны Астрожскай – і па жаночай лініі, а са смерцю ў 1673 г. праўнука Януша і спадкаемцы Астрожчыны па жаночай лініі кн. Аляксандра-Януша Заслаўскага – і род князёў Заслаўскіх па мужчынскай лініі, роднасных Астрожскім, са смерцю ж у 1709 г. Тэафіліі-Людвікі князёўны Заслаўскай згасае і жаночая лінія роду, а Астрожская ардынацыя трапляе да князёў Любамірскіх (другім мужам Тэафіліі быў Іосіф Любамірскі), затым – Сангушкаў[58].

Польскія і польскамоўныя аўтары XVII-XVIII стст. толькі паўтаралі інфармацыю Папроцкага і Стрыйкоўскага аб паходжанні Астрожскіх, не дадаўшы да яе практычна нічога новага[59]. З гэтага шэрагу выпадае толькі эпітафія на магіле К.

---

*czternastego wieku.*– S. 649-687; гл. таксама: Яковенко Н. М. *Українська шляхта з кінця XIV до середини XVII ст. (Волинь і Центральна Україна).* – К., 1993. – С. 76.

[56]*Родословная книга в трех списках, синодальном и двух других* / изд. Временника Императорского Московского Общества истории и древностей Российских. – Кн. X. – М., 1851. – С. 196, 158 з памылкай відавочна паліграфічнага характару.

[57]*AS.* – Lwów, 1887. – T. I. – №46. – S. 44. Слушная дата ўдакладнена ў каментарах – 1463 г. – S. 160; ЛНБ АР, ф. 5, воп. 1, спр. II, 1802, арк. 46 адв.

[58]Wolff J. *Kniaziowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku.* – S. 342-359, 604. Украінская даследчыца Н. Чаркаская памылкова падае апошнім князем Заслаўскім Уладзіслава-Дамініка, аднак ён памёр у 1656 г. – Черкаська Н. *З історії чуднівського архіву Жевуських* // Український археографічний збірник. – Вип. 18. – Т. 21. – К., 2013. – С. 10-11.

[59]*APAS.* Teka 129, plik 26, k. 1; plik 27, k. 1; Сярод матэрыялаў Астрожскай ардынацыі 1721-1756 гг. таксама знойдзены генеалогіі Астрожскіх, бо ардынаты Астрожскія намагаліся давесці свае права на спадчыну згаслага роду сваімі родавымі повязямі з ім – Krochmal A. *Materiały do dziejów Ukrainy i stosunków polsko-ukraińskich w zbiorach Instytucij polonijnych* // Biuletyn Ukrainoznawczy. – Przemyśl, 2002. – T. 8. – S. 207; Jabłonowski J. O. *Heraldica*. Lwów, 1752, tabely; Stebelski I. *Przydatek do chronologii...* – T. III. – Wilna, 1783. – S. 1, 5-6, 8-12, 24-25, 27, 34, 40-41, 65-67, 77-78; idem: *żywoty S.S. Eufrozyny i Paraskiewij z genealogia ksiązat Ostrogskich.* – T. I-III. – Wilno, 1781-1783; idem: *Genealogia*

І. Астрожскага: тэкст першаснага надпісу да пажару 1718 г., калі надпіс быў зменены ў час аднаўлення нагробка, збярогся ў рукапісным зборніку Сафійскага сабора 1693 г. Прывядзем тую яго частку, якая нас цікавіць: «Преставися благоверный и христолюбивый яснеосвецоный и велможный князь Константин Иванович Острозский, во всей Руссии славен сый, роду князей руских»[60]. Гэты надпіс зроблены адразу пасля пахавання князя ў Пячэрскай Лаўры сынамі Астрожскага, праўдападобна старэйшым сынам Іллёй, калі яшчэ не ўсчалася тэндэнцыя родатварэнняў і падаўжэнняў сваіх радаводаў другой паловы XVI ст., таму заслугоўвае ўвагі да сябе. Паўторымся: Астрожскія, зрэшты як і іншыя князёўскія роды, і да гэтага перыяду не маглі не помніць свайго паходжання, асабліва таго, з якога яны роду князёў[61]. Прыклад з кн. Софіяй Янушаўнай Заслаўскай, прыведзены Ю. Пузынам, наўрад ці можа быць характэрным: жанчына і сапраўды ў 1581 г. магла не ведаць сваіх продкаў далей за дзеда[62].

У далейшым дыскусія аб паходжанні князёў Астрожскіх то заціхала[63], то разгаралася з новай сілай, прычым узнікла версія

---

*starożytnego domu jaśnie oświeconych książat na Ostrogu Ostrogskich* // Przydatek do chronologii. – Lwów, 1867. – T. 3.

[60]Нацыянальная бібліятэка Ўкраіны імя Вернадскага, Інстытут рукапісу. Ф. Сафійскі, спр. 186/362-С, арк. 108 зв. – 109; Петров Н. И. *Две надгробные надписи конца XVII века Константину Ивановичу и Константину Константиновичу князьям Острожским* // Волынские епархиальные ведомости. – 1875. – №22. – С. 937-939; То же // Чтения в Историческом обществе Нестора-Летописца. – К., 1879. – Кн. 1. – С. 79-81; Военно-исторический вестник. – 1912. – Кн. 2. – С. 9-10.

[61]У 1574 г. у Балоны выйшла кніга Яна Красіньскага, дзе ён прама гаворыць, што В.-К. Астрожскі выводзіў свой род ад «старых кіеўскіх князёў, якія некалі панавалі на Русі» – гл.: Krasiński J. *Polska czyli opisanie topograficzno-polityczne w wieku XVI...* – Warszawa, 1852. – S. 112.

[62]Misięcznik Heraldyczny. – Lwów, 1935. – R. XIV. – S. 38-40, 88-91. Н. Якавенка таксама стала на гэты ж пунк гледжання, сцвярджаючы, што да 1570-х гадоў Астрожскія не ведалі сваіх продкаў – гл. Яковенко Н. *Паралельний світ*. – С. 244-246.

[63]Домбровский В. *Острожская старина* // Киевлянин. – Кн. 1. – К., 1840. – С. 81, 91; Перлштейн А. *Описание города Острога*. – М., 1847. – С. 2-4; он же: *Несколько слов о княжестве Острогском.* // Временник Императорского Московского Общества Истории и Древностей Российских. – Кн. 14. – М., 1852. – С. 40; Долгорукий П. *Российская родословная книга.* – Т. I. – С-Пб., 1854. – С. 130. Шараневич И. И. *О первых князьях на Острогу Острогских*//

паходжання Астрожскіх ад мясцовага валынскага баярскага (!) роду[64]. Пазней нечакана гэтая версія зноў узнікла: Я. Тэнгоўскі сцвярджае, што кн. Данііл быў далёкім сваяком валынскіх Раманавічаў, а паходзіў ад Рурыкавічаў, прычым ягоны продак быў не князем, а баярынам[65]. Датычна гэтай версіі можна прывесці вядомае выслоўе С. Арэхоўскага «Rex fit, dux nascitur» (каралём становяцца, князем нараджаюцца)*. Тытул перадаваўся толькі па крыві, і ніяк інакш; атрымаць яго за службу стала магчыма толькі з рук германскага імператара Святой Рымскай імперыі ў XVI ст. (Радзівілы двойчы і Сапега, але апошні ўжо ад папы рымскага, прычым Радзівілаў і Сапегаў працяглы час не

Галичанин: литературный сборник. – Львов, 1863. – Кн. 1. – Вып. 3-4. – С. 226-229; Костомаров Н. И. *Русская история в жизнеописаниях её главнейших деятелей*. – Вып. III. – С-Пб., 1874. – С. 536.

[64]Bartoszewicz J. *Ostrogscy*. // Encyklopedia powszechna Samuela Orgelbranda. – T. 20. – Warszawa, 1865. – S. 155.

[65]Tęgowski J. *Małżeństwa Lubarta Gedyminowicza. Pryczynek do genealogii dynastów halickowołyńskich w XIV wieku* // Genealogia. Studia i materiały historyczne. – T. 5/6. – 1995. – S. 23-25. Да яго прымыкае версія А. Журко аб баярска-балахоўскім мінулым Астрожскіх – Журко О. І. *Болохівська Русь: нові можливості і проблеми осягнення феномену* // Болохівщина: земля і люди. – Хмельницький, Стара Синява, Любар, 2000. – С. 3-8; Його ж: *До питання про походження і роль Острозького роду в історії* // Там само. – С. 217-221.

* Гэта вядомая калька з антычнага выразу «Poetae nascuntur, oratores fiunt« (паэтамі нараджаюцца, прамоўцамі становяцца), шыроканядомага на абшарах Польшчы, Літвы, Беларусі і Ўкраіны XVI ст. Выраз увёў ва ўжытак прызнаны ідэолаг русінства XVI ст. Станіслаў Арахоўскі-Раксалан – *Українські гуманісти епохи Відродження*. – К., 1995. – Ч. 1. – С. 370.

** Мікалай Радзівіл, ваявода віленскі і канцлер літоўскі, 25.02.1515 у Іннсбруку з рук імператара Максіміляна атрымлівае тытул князя Святой Рымскай імперыі на Гонядзі і Мядзелі, але ягоныя нашчадкі згаслі на дзецях. Паўторна на сойме ў Аўгсбургу 10.12.1547 імператар Святой Рымскай імперыі Карл V надаў Мікалаю Радзівілу Чорнаму і ягонаму брату Яну Радзівілу дыплом на тытул князёў Святой Рымскай імперыі на Несвіжы і Аліце, а іх стрыечнаму брату Мікалаю Радзівілу Рудому – на Біржах і Дубінках. 14.12.1547 кароль рымскі (кароль Германіі) Фердынанд I пацвердзіў тытул князя Мікалаю Радзівілу Чорнаму. 25.01.1549 на сойме ў Петрыкаве быў ратыфікаваны і зацьверджаны прывілей дому Радзівілаў на князёўства Святой Рымскай імперыі і адпаведных тытулаў. У інвентары Несвіжскага замка Радзівілаў сярэдзіны XVIII ст. значацца дзве карціны залы № 3: «Петрыкаўскі сойм» і «Пацьвярджэнне прывілея КарлаV» – гл.: Kotłubaj E. *Galereja Nieświeżka portretów Radziwiłłowskich*. – Wilno, 1857. – S. 62, 236; Wolff J. *Kniaziowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku*. – S. 675; Кандрацьева Г. *Інтэр'еры каралеўскіх апартаментаў у Нясвіжскім замку* // «Роднае слова». – № 6. – 2015. – С. 80.

прызнавалі князямі ў ВКЛ), і ніякім іншым чынам**. З'явілася версія паходжання Астрожскіх ад скандынаўскіх конунгаў, якія прыйшлі на Русь у часы Рурыка, але не звязаных з родам Рурыка[66]. Міхаіл Максімовіч запачаткаваў версію паходжання Астрожскіх ад турава-пінскіх князёў[67]. Аўтар пад крыптонімам J. Krz. (Józef Krzywicki[68]) укладвае ў рукі караля польскага Казіміра Вялікага прызначэнне свайго дарадцы Данілы Васільевіча (?), пляменніка караля рускага Данілы (?), на Астрог (гэта пасля паходу Данііла 1344 г. і бою з Казімірам на Вісле?! Ю. Пузына ўдакладніў атрыманне ад Казіміра Холма – паміж 1466 і 1476 гг., але пра Астрог ад Казіміра ён нічога не гаворыць)[69]. Між тым адносна імя па бацьку кн. Данііла – Васільевіч – і галіцка-валынскай версіі наогул яшчэ Максімовіч слушна заўважыў: «Даниил Острожский и его сын Федор – лица действительно исторические, также как и сын Даниила Галицкого, кн. Роман. Василь Романович – лицо призрачное, не бывшее ни между потомками Даниила Галицкого, ни между предками князей Острожских»[70].

Выдатны даследчык літоўска-рускіх князёў Юзаф Вольф абверг версію Папроцкага, Гваніні, Нясецкага і іх пераказнікаў аб паходжанні Астрожскіх ад Васіля Раманавіча, сына князя Галіцкага Рамана Мсціславіча (†1205), брата Данілы Раманавіча, караля рускага (†1266) і Міхаіла, родапачынальніка князёў Друцкіх. Ён давёў, што князь Валынскі Васілька Раманавіч (†1269) пакінуў сына Ўладзіміра-Івана князя Валынскага (†1288), памерлага бяздзетным, а нібыта родапачынальнік Друцкіх князь Міхаіл быў сынам абсалютна іншага князя – Рамана Аляксандравіча. Вольф схіліўся да больш праўдападобнай, на ягоную думку, версіі М. Максімовіча, да каторай мы яшчэ вернемся [71].

[66]Rulikowski Ł. W., Radzimiński Z. L. *Kniaziowie i szlachta między Sanem, Wieprzem, Bugem, Prypetią, Dnieprem, Sieniuchą, Dniestrem i północnymi stokami Karpat osiedleni.* – Kraków, 1888. – T. 1. – S. 11-14, 39-40.

[67]Максимович М. *Письма о князьях Острожских к графине А. Д. Блудовой.* – С. 3-6. То же: Максимович М. *Собрание сочинений.* – Т. I. – Киев, 1873. – С. 165-170.

[68]*Słownik geograficzny królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich.* – T. XV. – Cz. II. – Warszawa, 1902. – S. 743.

[69]Idem: T. VII, s. 684; Puzyna J. *Daniło ks. turowski, ostrogski i chełmski i jego potomstwo* // Miesięcznik Heraldyczny. – T. 10. – 1931. – S. 251-253.

[70]Максимович М. *Письма о князьях Острожских.* – С. 3.

[71]Wolff J. *Kniaziowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku.* – S. 55, 342.

Нарэшце варта разгледзець пазіцыю смаленскага даследчыка канца XIX ст. А. Ярушэвіча жыцця і дзейнасці кн. К. І. Астрожскага, які першы калі не абверг, то ва ўсялякім разе паставіў пад сумненне версію Максімовіча аб турава-пінскім паходжанні Астрожскіх[72]. Ярушэвіч пачаў з таго, што генеалогію Астрожскіх у Тэадаровіча назваў фікцыяй[73], схіліўшыся да версіі Стрыйкоўскага з ягонай хронікі аб паходжанні Астрожскіх з вялікай сям'і князёў Друцкіх, празарліва дадаўшы, што «магчыма нават, што Астрожскія – не спрадвечныя ўладальнікі Астрога». Скрытыкаваў і Максімовіча: «Максимович кажется погрешил, приняв приписку на помяннике «Туровских» за указание на происхождение: ведь и Радивилы писались князьями «На Несвиже». Яўна мелася на ўвазе тое, што К. І. Астрожскі валодаў Туравам, але не быў ягоным спадчынным уладальнікам – гэта было ягонае наданне ад вялікага князя. Ярушэвіч звяртае ўвагу і на прывілей Жыгімонта Казіміравіча ад 17 жніўня 1522 г. К. Астрожскаму, які дае яму права пячатання сваіх лістоў чырвоным воскам (да гэтага ён пячатаў лісты зялёным воскам), у тым ліку і лістоў да караля і вялікага князя, на што мелі права толькі ўладныя, удзельныя князі[74]. Аўтар мяркуе, што гэты прывілей сведчыць, што Астрожскія не паходзілі ад галіцкіх князёў (і тураўскіх таксама – Ю. К.), таму як захавалі б гэтае права пячаткі чырвонага воску паводле роду[75]. Дзіўна, што ні да, ні пасля Ярушэвіча на гэта ніхто не звярнуў увагу. Змешчаная радаводная схема Астрожскіх у Ярушэвіча таксама не ва ўсім супадае і са схемай у Вольфа, і з радаводамі Сцябельскага, Нясецкага, Зубрыцкага, Максімовіча і Банецкага[76].

---

[72]Ярушевич А. *Ревнитель православия, князь Константин Иванович Острожский (1461-1530) и православная литовская Русь в его время.*– Смоленск, 1897. – С. 46-47.

[73]Теодорович Н. И. *Историко-статистическое описание церквей и приходов Волынской епархии.* – Т. II. – С. 633-639.

[74]*Акты, относящиеся к истории западной России* / Изд. Археографической Комиссией. – С-Пб., 1847. – С. 143; Daniłowicz I. *Skarbiec dyplomatów...* / Wyd. J. Sidorowicz. – T. II. – 1862. – № 2290. – S. 295; *AS.* – T. III. – Lwów, 1889. – № CCXLI. – S. 235-236; *APAS*. Papiery. № 444.

[75]Ярушевич А. *Ревнитель православия, князь Константин Иванович Острожский*. – С. 170.

[76]Там же. – С. 249; Wolff J. *Kniaziowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku.* – S. 359; Зубрицкий Д. И. *История древнего Галичско-русского*

У XX ст. з'явілася літоўская версія паходжання Астрожскіх; паслядоўным прыхільнікам літоўскай версіі з'яўляецца польскі даследчык Ю. Пузына: ён даводзіць, што кн. Нарымунт-Глеб (больш слушна пісаць Нарымонт – паводле аналогіі: Жыгімонт, Судзімонт і да т. п.) Гедымінавіч у 1316-1317 гг. становіцца турава-пінскім князем, а ягоны сын Давід ёсць бацькам Данііла Астрожскага. Паміж 1466 і 1476 гг. кн. Данііл нібыта атрымлівае ад Казіміра III Холм, памірае ж ён у 1476 г: у гэтым годзе згаданы ягоны сын Юрый Данілавіч, дзяржаўца холмскі. Астатнія сыны Данііла паводле Пузыны – Фёдар, Міхаіл, Дзімітр і Аляксандр. Міхаіл Данілавіч і Дзімітр Валынскі гінуць у 1399 г. у бітве на Ворскле. Аляксандр становіцца родапачынальнікам князёў Чацьвярцінскіх. Яго падтрымалі С. М. Кучыньскі (гл. зноску 78), Н. Якавенка (апрача версіі паходжання Чацьвярцінскіх) і В. Выхаванец, супрацоўнік краязнаўчага музея Няцішына[77]. У гэтым плане цяжка не згадзіцца з Томашам Кемпам, што ў XVI ст. Астрожскім самім было б больш выгадна выставіць сябе Гедымінавічамі, але яны не пайшлі на гэта[78]. Не пайшлі, магчыма, яшчэ і таму, што род Гедымінавічаў быў адносна нядаўнім, ягоныя галіны былі вядомыя ўсім зацікаўленым у гэтым, сам Гедымін многімі сучаснікамі трактаваўся простым конюхам, захопнікам княжай улады, ягоныя сыны і ўнукі – бязроднымі нашчадкамі ўзурпатара*, а Астрожскія дакладна не былі Гедымінавічамі. Ускосна пра гэта сведчыць і прывілей

---

*княжества*. – Т. I. – Львов, 1852. – С. 63-64. Адам Банецкі наогул ухіліўся ад вырашэння пытання паходжання Астрожскіх, дальнабачна пачаўшы іх радавод ад кн. Данілы – Boniecki A. *Poczet rodów w Wielkiem księstwie Litewskiem w XV i XVI wieku.* – Warszawa, 1883. – S. 229-239.

[77]Puzyna J. *Narymunt Gedyminowicz* // Miesięcznik Heraldyczny. – T. 9. – 1930. – S. 37-38; Ten sam. – *Daniło ks. turowski, ostrogski i chełmski i jego potomstwo* // Ibidem. – T. 10. – 1931. – S. 251-256; Яковенко Н. М. *Українська шляхта...* – С. 89-90; вона ж: *Українська шляхта з кінця XIV – до середини XVII століття. Волинь і Центральна Україна.* Віданне друге, переглянуте і доповнено. – К., 2008. – С. 92-93; Вихованець В. *Ліквідація князівства Любартовичів або загадка Федора Даниловича Острозького* // Волинський музей: історія і сучасність. [Матеріали IV Міжнародної наукової конференції, 19-20 травня 2009 року, м. Луцьк] / Наук. збірник.– Луцьк, 2009. – Вип. 4; Він же. – *Князі Сангушки «Rodv. wyelkiego. knize. lithewskiĚ. olgierdowa»* / Электронны ресурс: http://volodymyrmuseum.com/ Рэжым доступу: 06.11.2018, 16.25.

[78]Kempa T. *Dzieje rodu Ostrogskich.* – Toruń, 2003. – S. 7.

Жыгімонта ад 25 сакавіка 1522 г. К. І. Астрожскаму на ўрад ваяводы троцкага, у каторым вялікі князь адмыслова агаворвае гэты прывілей як выключэнне з усталяванага правіла не прызначаць на гэты важны ўрад праваслаўных, але ў дадзеным выпадку яўна мелася на ўвазе не веравызнанне Астрожскага, а яго этнічнае паходжанне; на троцкае ваяводства і староства жамойцкае заўжды прызначаліся толькі літоўскія магнаты[79].

Але ў публікацыях была прынятая ў большасці выпадкаў турава-пінская версія паходжання Астрожскіх, зрэдку дадаваліся асобныя дэталі на карысць той або іншай версіі[80].

[79]*AS*. – T. III. – S. 220-222.

[80]*Гэтая легенда паходжання Гедыміна ўпершыню з'явілася ў прускіх хроніках XV ст., адкуль перайшла на старонкі хронік Марціна Кромера, Яна Длугаша, Іахіма Бельскага і маскоўскага «*Родословия великих князей литовских*». К. Х. *Острожские князья* // Брокгауз Ф. А., Ефрон И. А. Энциклопедический словарь. – Т. XXII. – С-Пб. – 1897. – С. 364; Лихач Е. *Острожский, князь Константин Иванович* // Русский биографический словарь / Изд. под наблюдением председателя Императоск. Русск. Истор. Общества А. А. Половцова. – С-Пб. – 1905. – С. 457; Г. Уласьеў даводзіць паходанне Астрожскіх ад малодшай галіны валынскіх Манамахавічаў – Раманавічаў: Власьев Г. А. *Происхождение князей Острожских* // Известия Имп. Русск. генеалогического общества. – Т. 3. – С-Пб. – 1906. – С. 347–354; Баумгартен Н. А. *Вторая галицкая династия* // Там же. – Т. 9. – 1909; Власьев Г. А. *Князья Острожские и Друцкие* // Там же. – Т. 4. – 1911; Jabłonowski A. *Pisma. T. 4: Wołyń, Podole, Ruś Czerwona.* – Warszawa, 1911. – S. 22; Kardaszewicz S. *Dzieje dawniejsze miasta Ostroga.* – Warszawa, 1913. – S. 2-3; Halecki O. *Ostatnie lata Świdrygiełły i sprawa wołyńska za Kazimierza Jagellończyka.* – Kraków, 1915. – S. 116; *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej* / Opr. przez Seweryna Hrabiego Uruskiego przy współudziale Adama Amilkara Kosińskiego, wykończony i uzupelniony przez Aleksandra Wlodarskiego. – T. XIII. – Warszawa, 1916. – S. 76; Навіцкі занатаваў астрожскую легенду, якая апавядае пра з'яўленне здані рыцара ў латах: «Рыцарь – это варяжский князь, не христианин (потому и не причащался), один из предков князей Острожских. – И. Н. (Новицкий И. В.) *Острожские легенды*, №42-43. – С. 653; Baumgarten N. *Halich et Ostrog.* // Orientalia Christiana Periodica. – Roma, Vol. 3. 1937. – P. 164-167; М. Андрусяк паўтарае версію валынскага паходжання Астрожскіх – Андрусяк М. *Останні Романовичі: нащадки Мстислава і Романа Даниловичів* // Науковий збірник Українського Вільного Університету. – Т. 5. Мюнхен. – 1948. – С. 1-12; Його ж: *Походження князів Острозьких* // Україна. – Ч. 7. – Париж, 1972. – С. 596; Шумовський П. *Острог: історичний нарис.* Маргет; Вінніпег, 1964; Е. Выразумскі называе кн.кн. Данілу Васількавіча (?) і Васіля Астрожскіх «з лініі слонімска-наваградскай Рурыкавічаў» – Wyrozumski J. *Ostrogski Wasyl książe //* Polski słownik biograficzny // PSB. – T. XXIV/3. – Wroclaw-Warszawa-Kraków-

Што да турава-пінскай версіі паходжання Астрожскіх, то ўяўляе цікавасць запіс кн. К. І. Астрожскага сваёй жонцы Таццяне Сямёнаўне Гальшанскай ад 8 красавіка 1514 года тысячы коп грошаў вена на Тураве[81]. Цікава, што ва ўсім тэксце запісу няма ніводнага згадвання аб валоданні ягонымі продкамі Туравам, паходжання іх з гэтага горада ці нейяк звязаных з пінска-тураўскай зямлёй, хаця пры гэтым князь не забывае прыгадаць свайго дзеда Васілія Краснага, які быў намеснікам тураўскім («каторым то замкам гаспадар кароль я. м. мне пажалаваў у айчызне, па таму як і дзед мой князь Васілей трымаў»). І нідзе ў іншых вядомых сёння пісьмовых крыніцах ні сам кн. Канстанцін Астрожскі, ні Жыгімонт Казіміравіч у сваіх прывілеях не гаворыць пра гэта. Пры гэтым не лішне прыгадаць палітычнага праціўніка К. Астрожскага Альбрэхта Гаштоўта, які гаворыць пра паходжанне Астрожскага, што ён «сын найбяднейшага князька»[82]. Гэта пры тым, што кн. Іван

Gdańsk, 1979. – S. 496; С. М. Кучыньскі ўхіліста называе Федзько-Фрыдэрыка Астрожскага нашчадкам Гедыміна і Рурыка. – Kuczyński S. M. *Fedko Fryderyk...* // PSB. – T. VI. –Kraków, 1948. – S. 382. Хаця сам жа ўжо яго бацьку Фёдара Данілавіча называе «бясспрэчным Гедымінавічам (насуперак даўнейшым прыпушчэнням што да Рурыкавага роду.»)  – tamże; Сагановіч Г. *Айчыну сваю баронячы: Канстанцін Астрожскі (1460-1530).* – Мн., 1992. – С. 7; Юхо І. А., Насевіч В. Л. *Астрожскія, княжацкі род герба «Астрога»…* // Гісторыя Беларусі, энцыклапедыя. – Т. 1. – Мн., 1993. – С. 223; ён жа: *Астрожскія,..* / Беларуская энцыклапедыя. – Т. 2. – Мн.,1996. – С. 56; Соболев Л. В. *Генеалогическая легенда рода князей Острожских* // Славяноведение. – №2, 2001. – С. 31-39; Томаш Кемпа разам з турава-пінскай версіяй не выключае паходжання Астрожскіх ад князёў чарнігава-северскіх, слонімска-навааградскіх ці нейкіх іншых паўночна-заходніх княжых родаў – Kempa T. *Dzieje rodu Ostrogskich.* – Toruń, 2003. – S. 7; І. Міцько праз складаную доказную базу праводзіць думку паходжання Астрожскіх ад кн. Друцкіх – Мицько І. *Загадки родоводу князів Острозьких: хто був протопластою роду?* // Острозький краєзнавчий збірник. – Вип. 4. Острог, 2010. – С. 4-5. М. Бендзюк праводзіць думку, што карона на скульптуры лаўраўскага нагробку К. І. Астрожскага ёсць каралеўскаю і гэта нібыта ўказвае на паходжанне Астрожскіх ад караля Данілы Галіцкага і права гэтага роду на каралеўскі сталец – Бендюк М. *Корона князів Острозьких* // Історія музейництва, пам’яткоохоронної справи, краєзнавства і туризму в Острозі та на Волині. – Вип. 3. – Острог, 2011. – С. 252-253; Пазднякоў В. *Астрожскія, княжацкі род уласнага герба* // Вялікае княства Літоўскае, энцыклапедыя. – Т. І. – Мн., 2007. – С. 262-263.

[81]Malinowski M., Przezdziecki A. *Żrzódla do dziejów polskich.* – T. II. – Wilno, 1844. – S. 424-425.

[82]Ліст А. Гаштоўта да Боны Сфорцы 1525 г.: *Bonee Sphortie Regina Poloniae*

Астрожскі ўжо быў далёка не «найбяднейшым князьком» у XV ст., але маёмасная заможнасць тады не магла замяняць радавітасці паходжання суб'екта, і Гаштоўт яўна меў на ўвазе менавіта гэтую акалічнасць, у каторай ён, як зацікаўлены ў гэтым палітык, без сумнення быў абазнаны[83]. Так што версію турава-пінскага паходжання Астрожскіх сёння можна зняць як неабгрунтаваную.

Між тым ёсць неабходнасць вярнуцца да знаходкі яшчэ Міхаіла Максімовіча 1866 года. «Я обратился к старым помянникам киевских церквей, где записан «род князя Константина Ивановича Острозского» вскоре после его погребения в Печерской церкви, т. е. еще в тридцатых годах шестнадцатого века», – піша Максімовіч. Гэты запіс апублікаваны ў 1859 г.[84] Паводле гэтага памянніка, выходзіць наступны ланцужок: (памінаць) «1) князя Георгия, 2) князя Дмитрия, 3) князя Даниила, 4) князя Федора, в иноках Феодосия», і г. д. «Несомненно, что эти имена были написаны для церковного поминовения еще самим кн. Константином», – дадае Максімовіч. Згаданыя ў памянніку імёны княгінь такія: «1) княгиня Варвара, 2) княгиня инокиня Елисавета, 3) княгиня Василисса, 4) княгиня Агафия, в инокинях Агрипина...[85] У «Памянніках» стаіць важнае пазначэнне аўтара запісу, г. зн. самога К. І. Астрожскага – «князи Гуровскии». Максімовіч прыняў яго

*Albertus Gastold palatini Vilnensis contra ducem Constantini de Ostrog et contra Radivillones. 2.VI.1525* / Acta Tomiciana. – T. VII. Poznań, 1859. – S. 258-269. Гл. таксама разгледжаны вышэй прывілей К. І. Астрожскаму на права пячатання лістоў чырвоным воскам, каторага ён да гэтага не меў з-за нязначнасці свайго паходжання.

[83]А. Гурэвіч на гэты конт адзначае: «Вага чалавека залежыць у першую чаргу не ад яго маёмаснага стану, а ад таго, якімі правамі ён валодае. Бяднейшы дваранін вышэй самага багатага гараджаніна, таму як грошы і нават валоданне зямельнай уласнасцю не даюць прызнання і шырокіх правоў – неабходна высакароднае паходжанне ці манаршая міласць для таго, каб быць шляхетным і паўнапраўным.» – гл.: Гуревич А. Я. *Категории средневековой культуры.* – М., 1972. – С. 156. Больш поўна пра гэты аспект даўнейшага грамадства гядзі: Сокол С. Ф. *Политическая и правовая мысль в Белоруссии XVI – первой пол. XVII в.* – Мн., 1984.

[84]*Памятники изданные Временною комиссиею для разбора древних актов, высочайше учрежденною при киевском военном, подольском и волынском генерал-губернаторе.* – Т. IV, отд. I. – К., 1859. – С. III, 107-117.

[85]Максимович М. *Письма о князьях Острожских к графине А. Д. Блудововй.* – С. 4-5; то же: Максимович М. *Собрание сочинений.* – С. 166-167.

за памылку: «явная ошибка вместо Туровскии. Эта маленькая заметка, в них сохранившаяся, вернее всех генеалогов указывает нам на князей Острожских, как на отрасль князей Туровских и Пинских. Князья эти произошли от Владимира Святого через его правнука Святополка Изяславовича; внук Святополка был Юрий Ярославич, а его внук был Владимир князь Пинский, отец Юрия или Георгия, в котором мы узнали подлинного родоначальника князей Острожских [86]».

Гэтае выпраўленне ў запісе памянніка М. Максімовічам стала пачаткам трактоўкі паходжання Астрожскіх ад турава-пінскіх князёў для цэлага шэрагу гісторыкаў, генеолагаў і геральдыстаў, што мы разглядалі вышэй.

А што, калі памыліўся не кн. Канстанцін Астрожскі (калі толькі ў самой выпісцы з памянніка ў яе публікацыі няма памылкі, што таксама нельга выключаць), а памыліўся сам Максімовіч? Што, калі ў пазначэнні аўтара запісу ніякай памылкі няма? Цяжка дапусціць, што ў такім важным запісе для свайго роду, кн. Канстанцін мог дапусціць памылку. Літары «Г» і «Т» у скорапісе XVI ст. не карэлююцца і іх складана зблытаць. У гады жыцця Канстанціна Іванавіча ніякіх памкненняў да «прэстыжнага» родатварэння ў князёўскім асяроддзі яшчэ і блізка не адзначана, і ён яўна пісаў сапраўдны радавод сваіх продкаў. Імёны князя Георгія і княгіні Варвары прысутнічаюць і ў памянніку дубенскай царквы[87].

А што наогул вядома нам аб гістарычнасці князёў Гураўскіх? Практычна нічога: у пісьмовых помніках іх выявіць пакуль што не ўдаецца. Юзаф Вольф гаворыць аб наяўнасці князёўскіх патронімаў і прыдомкаў падобнага гучання: Гурко (Hurko),

[86]Там жа. М. Максімовіч далей прасочвае звесткі пра кн. Юрыя: «Юрий Владимирович появляется в летописании в 1262 г. по случаю победы над Литвою, одержанной Волынским князем Васильком Романовичем под городом Неблем. «Се же услышавши князи – Пиньстии Федор и Демид и Юрьи, и приехаша в Василькови с питьем и начаша веселитися, видяще бо ворогы своя избиты, а своя дружина вся цэла.» А в конце Волынской летописи читаем следующее: »В лето 6800 (1292) преставился Пинский князь Юрий, сын Володимеров, кроткий, смиренный, правдивый; и плакася по нем княгини его, и вси людье плакахуся по нем плачем великим». Из его сыновей мы знаем уже князя Дмитрия, с которого и начинаются князья Острожские.»

[87]Максимович М. *Письма о князьях Острожских к графине А. Д. Блудововй*. – С. 5.

Гурковіч (Hurkowicz)[88]. Але відавочна, што гэта не той выпадак; яны ўсе патронімы, а не прыдомкі, бо патранімічнага паходжання ад ул. імя Гурый/Гурко, на што ўказвае сама форма імяўтварэння: Гурковіч – нашчадак продка па імені Гурко. Гураўскія ж – яўна паходжання тапанімічнага, г. зн. ад пэўнае мясцовасці або населенага пункта, тапоніма, што не выклікае сумненняў; параўнай са шматлікай групай аналогій: Астрожскія (ад Астрога), Заслаўскія (ад Заслава), Мсціслаўскія (ад Мсціслава), Друцкія, і г. д. А гэта азначае, што гэтым зыходным пунктам павінны быць населены пункт пад назвай Гураў (Гуров), магчыма Гур ці Гура.

На жаль, работа з даступным картаграфічным матэрыялам не дала станоўчых вынікаў. Вывучэнне такога пісьмовага помніка, як «Список русских городов дальних и ближних» М. Ціхамірава[89], найбольш поўна прадстаўляючы назвы гарадоў XIII-XIV ст.ст. цікавячых нас абшараў, таксама не выявіў наяўнасці горада Гураў. Але гэта зусім не азначае, што такога населенага пункта не было ў сапраўднасці: гэта мог быць нават не горад, а княжы замак, названы ад бліжэйшага пасялення не гарадскога кшталту (бліжэйшы прыклад – князі Машкоўскія, Горскія і Багрынаўскія з галіны князёў Друцкіх), або ўрочышча ці воднага аб’екта – ракі ці возера. А ў такім выпадку гэты аб’ект найбольш верагодна сустрэць не на картаграфічным, а толькі ў актавым матэрыяле. Як і згадванне саміх князёў Гураўскіх. Так што пытанне гістарычнага існавання князёў Гураўскіх не здымаецца.

*Юрка Коптик* К вопросу происхождения князей Острожских.

Исследование посвящено вопросу происхождения известного в XIV-XVII вв. в Великом княжестве Литовском и Речи Посполитой рода князей Острожских и их ответвления князей Заславских. Основное внимание посвящено критическому анализу всей историографии происхождения князей Острожских, с акцентом на узловых пунктах исследований других авторов, которые открывают новые версии происхождения этого княжеского рода. На основании проведенного обзора историографии автор выделяет наиболее обоснованные версии происхождения Острожских

[88] Wolff J. *Kniaziowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku*. – S. XXII.

[89] Тихомиров М. Н. *Список русских городов дальних и ближних* / Исторические записки. – Т. 40. – М., 1952. – С. 214-259.

за все время. Рассматривается также проблема происхождения названия города Острог и его связи с гербовой символикой князей Острожских. В завершение исследования автор предлагает свою версию происхождения князей Острожских от князей Гуровских, взвешивает все «за» и «против» этой версии.

*Ключевые слова*: князья Острожские, Острог, Великое княжество Литовское, Речь Посполитая, Волынь, гербы князей Острожских.

*Yurka Koptik* The question of the origin of Ostrog princes.

The study is devoted to the origin of the well-known in the XIV-XVII centuries in the Grand Duchy of Lithuania and Rzeczpospolita kind of Ostrog princes and their branches princes Zaslavsky. The main attention is devoted to a critical analysis of the entire historiography origin princes of Ostrog, with emphasis on the nodal points of other authors who open a new version of the origin of the princely family. Based on the review of the historiography, the author identifies the most relevant versions of the origin of Ostrog ever. We also consider the problem of the origin of the name of the city of Ostrog and its relationship with official symbols of the Ostrog princes. At the end of the study the author offers his own version of the origin of the princes of Ostrog from princes Gurovsky, weighing all the «pros» and «cons» of this version.

*Keywords*: Ostrog princes, Ostrog, the Grand Duchy of Lithuania, Rzeczpospolita, Volyn, ostrogski coat of arms.

Выява 1.



Пячатка Данііла князя з Астрога 1366 г. – Однороженко О. Геральдика князів Острозьких у світлі нововиявлених джерел. – С. 110.

Выява 2.



Прамалёўка А. Аднарожанкі герба Фёдара Данілавіча Астрожскага з пячаткі 1387 г. – Однороженко О. Геральдика князів Острозьких у світлі нововиявлених джерел. – С. 111.

Выява 3.



Пячатка Фрыдэрыка Фёдаравіча князя Астрожскага 1438 г. – Однороженко О. Геральдика князів Острозьких у світлі нововиявлених джерел // Антиквар. – № 5-6 (102). – Травень-червень, 2017. – С. 111.

Выява 4[1].




Пячатка Канстанціна Іванавіча князя Астрожскага 1508 г.

Пячатка князя Фёдара Пятровіча Галаўні-Астрожацкага 1551 г.

[1] Однороженко О. До історії української генеалогії та геральдики: княжі роди XIV-XVII ст. с. 27.

Выява 5.



Выява герба Канстанціна Астрожскага на карціне «Бітва пад Оршай».

Выява 6.




Паводле А. Аднарожанкі. Пячатка Іллі Кастанцінавіча князя Астрожскага 1535 г. – Однороженко О. Геральдика князів Острозьких у світлі нововиявлених джерел. – С. 114.

Выява 7.



Паводле А. Аднарожанкі.Пячатка Васіля-Канстанціна князя Астрожскага 1551 г. – Однороженко О. Геральдика князів Острозьких у світлі нововиявлених джерел. – С. 114.

Выява 8.



Герб кн. В.-К. Астрожскага з астрожскай «Азбукі» 1578 г.

Выява 9.





Прамалёўкі з пячатак кн. Аляксандра Чацьвяртні 1387-1388 гг., узятыя з геральдычных выпісаў Яна Замойскага.